УДК 372.882

**С.Д. Грынько**
(Гродна, Беларусь)

# ВЫКАРЫСТАННЕ СРОДКАЎ МУЗЕЙНАЙ ПЕДАГОГІКІ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОВАХ

*У артыкуле раскрываюцца магчымасці выкарыстання сродкаў музейнай педагогікі ў адукацыйным працэсе, асвятляюцца метадычныя аспекты выкарыстання гэтай тэхналогіі пры выкладанні беларускай літаратуры ў навучальных установах.*

Напэўна, кожны чалавек ведае, што уяўляе з сябе музей, бо неаднойчы быў у гэтай установе, атрымліваў асалоду ад успрымання экспазіцыі, захапляўся цікавай інфармацый, адчуваючы подых гісторыі і энергетычную сувязь рэчаў з гістарычнай постаццю, якая прадстаўлена ў музеі. Аднак ці кожны наведвальнік можа ацаніць адукацыйнае значэнне гэтай культурнай установы, уплыў яе на асобу, тым больш звязаць дзейнасць музея з жыццём кожнага чалавека? Яшчэ на пачатку ХХ стагоддзя рускі філосаф М.Ф. Фёдараў выказаў думку, што “ўсякі чалавек носіць у сабе музей” [7, с. 4], абгрунтаваўшы яе тым, што “захаванне – гэта закон карэнны, якія папярэднічаў чалавеку, дзейнічаў да яго” [7, с. 4]. Зыходзячы са слоў знакамітага філосафа, беражлівыя адносіны да культурнай спадчыны – гэта аб’ектыўны закон, уласцівасць жывой і нежывой прыроды, якому падпарадкоўваецца чалавек, бо ён так ці інакш на яго дзейнічае. Чаму так адбываецца? Напэўна таму, што ў мінулым вопыце і яго набытках мы знаходзім адказ на пытанні, якія задае нам сучаснасць, а будучае заўсёды павінна быць падмацавана гістарычным вопытам. І гэты закон



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прыроды, які сцвярджае непарыўную сувязь мінулага, сучаснага і будучага, дае магчымасць глыбока ўсвядоміць і зразумець музей.

Азначэнне паняцця “музей” (ад грэчаскага слова museion “храм музаў”), якое ў комплексе ілюструе ўсю яго дзейнасць, даецца ў падручніку па “Музеязнаўстве”: “Музей – гістарычна абумоўлены шматфункцыянальны інстытут сацыяльнай інфармацыі, прызначэнне якога ў захаванні культурна-гістарычных і прыродазнаўчых каштоўнасцей, назапашванні і распаўсюджванні інфармацыі пры дапамозе музейных прадметаў. Дакументуючы працэс і з’явы прыроды і грамадства, музей камплектуе, захоўвае, даследуе калекцыі музейных прадметаў, а таксама выкарыстоўвае іх у навуковых, навучальна-выхаваўчых і прапагандысцкіх мэтах” [2, с. 18]. Як бачна, музей – гэта скарбонка каштоўнасцей, назапашаных чалавецтвам, “найважнейшых сведчанняў гісторыі”, якія могуць быць мэтанакіравана выкарыстаны ў адукацыйным працэсе. Сучаснае азначэнне музея і яго функцый знаходзім у расійскай музейнай энцыклапедыі: “Музей – культурная форма, гістарычна выпрацаваная чалавецтвам для захавання, актуалізацыі і трансляцыі наступным пакаленням найбольш каштоўнай часткі культурнай і прыроднай спадчыны” [5]. Гэту важную грамадскую і асветніцкую місію музей пашырае і на адукацыйныя ўстановы, прапануючы наведвальнікам розныя віды экскурсій, музейных заняткаў, забаўляльных і гульнявых мерапрыемстваў. Па вызначэнні даследчыка дзейнасці музеяў К.Г. Плытнік, сучасны “музей становіцца месцам дыялогу, пляцоўкай для культурнага абмену, творцам новых і захавальнікам старых каштоўнасцей” [4, с. 67]. Такім чынам, сродкамі “храма музаў” асоба навучэнца далучаецца да свету культуры, найлепшых здабыткаў чалавецтва ў свеце матэрыяльных і духоўных багаццяў.

Многія навукоўцы ў галіне педагогікі сёння выказваюцца за тое, што працэс адукацыі асобы – гэта ёсць не што іншае, як далучэнне асобы да культурнай спадчыны і ўключэнне яе ў культуратворчую дзейнасць. Напрыклад, згодна з меркаваннем вядомага расійскага даследчыка ў галіне педагагічных навук В.У. Краеўскага, “змест адукацыі павінен адпавядаць зместу сацыяльна-культурнага вопыту” [1, с. 44], гэта значыць, што ўсе чатыры кампаненты адукацыйнага зместу (веды, уменні, вопыт творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасныя адносіны) павінны адпавядаць культурным здабыткам грамадства. І тут, на наш погляд, роля музея пры арганізацыі педагагічнага працэсу з’яўляецца вельмі важнай, паколькі гэта ўстанова згодна са сваімі функцыямі збірае, захоўвае і рэпрэзентуе найбольш каштоўныя здабыткі грамадства, і асоба пападае пад іх уздзеянне шляхам пагружэння праз зрокавае, эмацыянальнае ўспрыманне, эстэтычнае захапленне і інфармацыйную зацікаўленасць. Гэта і складае аснову для комплекснага ўздзеяння “храма муз” на наведвальніка. Вельмі важным, на наш погляд, з’яўляецца тое, што за кошт такога шматпланавага ўздзеяння дасягаецца ўплыў на светапогляд навучэнца, на яго разуменне мастацтва, грамадскага жыцця, навуковых паняццяў, а ў рэшце рэшт, усяго чалавецтва і самога сябе.

Культурна-адукацыйныя аспекты музейнай дзейнасці з’яўляюцца прадметам даследавання музейнай педагогікі – навуковай дысцыпліны, якая ўзнікла на стыку

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

музеязнаўства, педагогікі і псіхалогіі яшчэ на мяжы ХІХ–ХХ стагоддзя ў Германіі. У тэорыю і практыку музейнай педагогікі на сучасным этапе яе развіцця вялікі ўклад уносяць вучоныя Расіі: Б.А. Сталяроў, М.Ю. Юхневіч, А.Б. Мядзведзева, М.В. Нагорскі, А.Г. Ванслава.

На сённяшні дзень музейную педагогіку вызначаюць як навуковую галіну ведаў, якая вывучае "гісторыю, асаблівасці культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, метады ўздзеяння музеяў на розныя катэгорыі наведвальнікаў, узаемадзеянне музеяў з адукацыйнымі ўстановамі" [3]. Мэта музейнай педагогікі – гэта далучэнне да музеяў маладога пакалення, а таксама творчае развіццё асобы [3].

Аб унікальнасці музейнага асяроддзя і яго ролі ў фарміраванні асобы гавораць даследчык Б.А. Сталяроў, які акцэнтуе ўвагу на тое, што гэта асяроддзе, у адрозненні ад школьнага, "валодае эстэтычнай аўрай, мастацкім і творчым зместам, а значыць – магутным духоўным патэнцыялам" [6, с. 106]. Называючы кампаненты музейнага асяроддзя, сярод якіх "навакольная музейная прастора, уласна музейная пабудова, экспазіцыя як прэзентацыя музейных помнікаў", Б. А. Сталяроў слушна сцвярджае, што іх узаемадзеянне дазваляе ператварыць культурны вопыт "у асобасныя якасці чалавека, які фарміруецца" [6, с. 107].

Такім чынам, ужо само музейнае асяроддзе можа стаць значным адукацыйным сродкам у працэсе далучэння асобы да культурных набыткаў грамадства, што і павінна з'яўляцца зместам адукацыі.

Акрамя гэтага, шырокі спектр формаў культурна-асветніцкай дзейнасці музеяў дае магчымасць наведвальнікам любога ўзросту, з рознай сферай інтарэсаў задаволіць свае патрэбы ў спасціжэнні культурнага патэнцыялу грамадства, дае магчымасць належным чынам ацаніць багацце і непаўторнасць культурнай спадчыны перш за ўсё свайго рэгіёну, сваёй мясцовасці. Да традыцыйных формаў працы музея можна аднесці экскурсіі і лекцыі, якія склаліся яшчэ ў канцы ХІХ стагоддзя. З сярэдзіны 80-х гадоў ХХ стагоддзя распаўсюджваюцца такія жанры экскурсій, як тэатралізаваныя экскурсіі, экскурсіі-гутаркі, экскурсіі-ўрокі і інш. Сярод клубных формаў музейнай работы можна прывесці наступныя: музычныя і літаратурныя гасцёўні, вечары, музейныя святы, гурткі, клубы. Папулярнасць набываюць і шматлікія забаўляльныя формы, якія становяцца арганічнай часткай музейных заняткаў для школьнікаў рознага ўзросту: гульні, квэсты, віктарыны і інш.

Увесь гэты арсенал формаў супрацоўніцтва навучальных устаноў і музея ў межах яго культурна-асветніцкай дзейнасці можа быць выкарыстаны на ўроках беларускай літаратуры. На нашу думку, выхоўваць патрыятызм, грамадзянскасць, гонар за сваю Бацькаўшчыну немагчыма без ведання сваіх каранёў, гістарычнага мінулага, культурнай спадчыны, часткай якой і з'яўляецца літаратура. Умець данесці прыгажосць роднага **слова** да навучэнцаў, навучыць разумець мастацкую вартасць тэксту, выхаваць пачуццё гонару за літаратурную спадчыну свайго народа – справа складаная і карпатлівая для настаўніка, якая патрабуе як творчага падыходу і асабістай аддачы, так і вялікай колькасці метадычных сродкаў, што будуць фарміраваць свядомасць асобы, яе светаўспрыманне. З гэтай мэтай на ўроках беларускай літаратуры могуць выкарыстоўвацца музеі самага рознага профілю:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

гістарычнага, краязнаўчага, літаратурнага. Гэта можа быць як гарадскі музей, так і музей установы адукацыі, дзе арганізуецца адукацыйны працэс. Усё залежыць ад тэмы, якая вывучаецца, ад мэты і задач урока, ад узроўню падрыхтаванасці навучэнцаў і, безумоўна, ад метадычнай падрыхтаванасці педагога. У музеях горада Гродна (Музей Максіма Багдановіча, Музей гісторыі рэлігіі, Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей) могуць вывучацца наступныя тэмы ў дзявятым класе: "Жыццёвы і творчы шлях Максіма Багдановіча", "Літаратура эпохі Сярэднявечча", "Жыццёвы і творчы шлях Ф. Багушэвіча", "Літаратурная спадчына Алаізы Пашкевіч". Пры гэтым любы краязнаўчы музей у навучальнай установе можа быць выкарыстаны не на цэлы ўрок, а на яго частку для тлумачэння новых словаў, стварэння творчай атмасферы, для ўводнай гутаркі перад вывучэннем раздзела, у час правядзення конкурсу на самы лепшы прачытаны верш і г. д.

Выкарыстанне любой формы супрацоўніцтва з музеем на ўроках роднай літаратуры патрабуе работы педагога на некалькіх этапах:

1) падрыхтоўчы;

2) наведванне музея і агляд экспазіцыі;

3) падвядзенне вынікаў экскурсіі.

На першым этапе настаўнік паведамляе мэту наведвання музея, арыентуе навучэнцаў на выкананне задання пасля заняткаў, нагадвае аб правілах паводзін у гэтай установе. Вельмі важна для педагога зацікавіць навучэнцаў экспазіцыяй так, каб адчувалася загадкавасць, нейкая інтрыга, якую трэба раскрыць пасля наведвання "храма музаў". Дзеля папярэдняй ацэнкі эфектыўнасці формы сумеснай працы з гэтай установай настаўніку неабходна дакладна ведаць запланаваныя віды работы экскурсавода і спецыфіку музейнай экспазіцыі і інфармацыі. Усё гэта педагог робіць сумесна з супрацоўнікам музея.

На другім этапе арганізоўваецца наведванне і агляд экспазіцыі. Навучэнцы слухаюць уважліва інфармацыю, адказваюць на пытанні экскурсавода, выконваюць заданні, абменьваюцца меркаваннямі. Самае галоўнае на гэтым этапе – гэта сумесная творчая праца, бадзёры настрой, захопленасць эмоцыямі, абмен уражаннямі, пры якім педагог – гэта старэйшы, больш вопытны таварыш, саратнік у супольнай працы.

Папярэдняе падвядзенне вынікаў можа быць праведзена непасрэдна ў музеі ў форме праблемнай гутаркі, рэфлексіі, узаемных пажаданняў адзін аднаму. Падвядзенне вынікаў у класе павінна адпавядаць мэце заняткаў і насіць творчы характар. Навучэнцы дзеляцца ўражаннямі і ў любой форме выкладаюць свае веды па вывучанай тэме: малюнкі, эсэ, даклады, прэзентацыі, тэатралізаваныя інсцэніроўкі, вершы і г. д. (схема).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Арганізацыя працы з музеем на уроках беларускай літаратуры**




Такім чынам, выкарыстоўваючы сродкі музейнай педагогікі ў адукацыйным працэсе пры выкладанні беларускай літаратуры, педагог мае магчымасць сфарміраваць цэласнае ўяўленне ў навучэнцаў аб літаратурным працэсе, узбагаціць яго падрабязнасцямі, дэталямі, а самае галоўнае – паўплываць на свядомасць асобы, выхаваць пачуццё гонару за сваю нацыянальную спадчыну. Паколькі толькі шлях, які вядзе чалавека праз пазнанне сваёй гістарычнай і прыроднай сутнасці, можа прывесці чалавека да разумення свайго прызначэння ў свеце. Далучыцца да культурнай спадчыны народа, да якога ты належыш, праз вытокі роднага слова ў літаратурнай спадчыне – гэта адзін з напрамкаў для навучэнца на шляху да ўласнага развіцця і самаўдасканалення на аснове ведання і разумення сваёй ўнікальнасці ў культурнай прасторы. І гэты шлях праходзіць праз музей.

**Спіс літаратуры**

1. Краевский, В. В. Общие основы педагогики : учебное пособие / В. В. Краевский. – М. : Академия, 2003. – 256 с.
2. Музееведение: музеи ист. Профиля : учеб. пособие для вузов по спец. «История» / под ред. К. Б. Левыкина, В. Хербета. – М. : Высш. шк., 1988. – 430 с.
3. Музейная педагогика [Электронный ресурс] // Педагогический терминологический словарь / Режим доступа: http://pedagogical_dictionary.academic.ru/1998/Музейная_педагогика. – Дата доступа: 12.03.2019.
4. Плытник, Е. Г. К вопросу о взаимодействии музея и местного сообщества / Е. Г. Плытник // Искусство и культура. – 2018. – № 2. – С. 67–71.
5. Словарь музейных терминов. Музей. [Электронный ресурс] // Росийская музейная энциклопедия – Режим доступа: http://www.museum.ru/RME/dictionary.asp?40. – Дата доступа: 23.02.2019.
6. Столяров, Б. А. Музейная педагогика. История, теория, практика : учеб. пособие / Б. А. Столяров. – М. : Высш. шк., 2004. – 216 с.
7. Фёдоров, Н. Ф. Музей, его смысл и назначение // Музейное дело и храна памятников. – М. : Российская государственная библиотека, 1992. – 60 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова